Водзыў

на аўтарэферат дысертацыі В.А. Мусіенкі «Семантычная дэрывацыя ў сферы ментальных намінацый: на матэрыяле беларускай і англійскай моў», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства

***Актуальнасць тэмы дысертацыйнага даследавання.***

Кожная нацыя мае сваё светаўспрыманне і ўвасабляе яго ў сваёй асаблівай, непаўторнай праекцыі, мае свой спосаб канцэптуалізацыі, які кваліфікуецца як сукупнасць ведаў, думак, уяўленняў аб свеце. Моўныя сродкі, якія служаць для вербалізацыі чалавека, фарміруюцца пад уздзеяннем гістарычнай эпохі, прыроды і ландшафту, спадчыннасці, узроўню культурнага развіцця соцыума, тлумачацца традыцыямі таго ці іншага народа, спецыфікай яго мыслення. Такая пільная ўвага лінгвістычнай навукі да чалавека і яго ментальных здольнасцей сведчыць аб важнасці антрапацэнтрызму як асноватворнага метадалагічнага прынцыпу, дзе не толькі чалавек з'яўляецца «мерай усіх рэчаў», але і рэчы лічацца мерай людзей.

Дысертацыйные даследаванне В.А. Мусіенкі актуальнае сваім зваротам да адной з важных і нераспрацаваных праблем параўнальнай лексікалогіі – аналізу беларускіх і англійскіх ментальных намінацый.

***Ступень навізны вынікаў, атрыманых у дысертацыі, і навуковых палажэнняў, вынесеных на абарону.***

У адпаведнасці з пастаўленымі задачамі дысертант ажыццяўляе комплекснае апісанне лінгвістычнай прыроды ментальных лексічных адзінак: выяўляе найбольш поўны корпус другасных ментальных лексіка-семантычных варыянтаў у іменных і дзеяслоўных намінацыях беларускай і англійскай моў; праводзіць семантычную класіфікацыю ментальных субстантываў, ад'ектываў і дзеясловаў у адпаведнасці з характарам суаднесенасці зыходнага і вытворнага лексіка-семантычных варыянтаў; канструюе асноўныя ментальныя мадэлі семантычнай дэрывацыі; выяўляе тыпалагічнае падабенства і нацыянальна-культурныя адрозненні рэпрэзентацыі другасных ментальных намінацый у беларускай і англійскай мовах; характарызуе асноўныя тыпы семантычнай эквівалентнасці беларускіх і англійскіх ментальных лексічных адзінак. Структура працы В.А. Мусіенкі, як сведчыць аўтарэферат, лагічная. Паслядоўнасць моўнага аналізу, абгрунтаванасць і дакладнасць вынікаў дысертацыі сведчаць пра глыбокае валоданне аўтара як тэарэтычнай базай, так і методыкай навуковага даследавання.

***Навуковая і практычная значнасць вынікаў і асноўных палажэнняў дысертацыі.***

**Навуковая навізна і значнасць** дысертацыйнага даследавання В.А. Мусіенкі вызначаецца тым, што ў ім упершыню акрэслены аб'ём паняцця "ментальныя намінацыі", прапанаваны крытэрыі дыферэнцыяцыі аказіянальных і ўзуальных лексіка-семантычных варыянтаў ментальнай скіраванасці, распрацавана метадалогія класіфікацыі другасных намінацый, устаноўлены мадэлі ўтварэння другасных ЛСВ на аснове выкарыстання зыходных ЛСВ субстантыўных, ад'ектыўных і дзеяслоўных намінацый. Супастаўляльнае даследаванне беларускіх і англійскіх ментальных лексічных адзінак дазволіла выявіць тыпалагічныя і спецыфічныя мадэлі семантычнай дэрывацыі, тыпы міжмоўных карэляцый з адносінамі семантычнага супадзення, частковай эквівалентнасці і безэквівалентнасці. Упершыню створаны першы ў лексікаграфічнай практыцы «Беларуска-англійскі тлумачальны слоўнік другасных ментальных намінацый». Дакладнасць вынікаў дысертацыі забяспечваецца грунтоўнай тэарэтычнай базай, значным аб'ёмам фактычнага матэрыялу і яго шматаспектнай граматнай інтэрпрэтацыяй.

**Практычная значнасць** работы В. А. Мусіенкі не выклікае сумненняў: асноўныя распрацоўкі дысертацыі маюць важнае значэнне для сучаснай кампаратывістыкі, беларусістыкі і англістыкі і могуць быць выкарыстаны як пры падрыхтоўцы прац па параўнальнай тыпалогіі, дэрываталогіі, так і пры выкладанні ў ВНУ практыкі вуснага і пісьмовага маўлення беларускай і англійскай моў, пры ўкладанні рознага тыпу слоўнікаў. Дысертацыйнае даследаванне адметнае лінгвакультуралагічнай скіраванасцю, што выключна важна ў сувязі з актывізацыяй сучасных працэсаў глабалізацыі і міжмоўнай камунікацыі.

***Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.***

У аўтарэфераце адлюстравана публікацыйная актыўнасць саіскальніка: навуковыя вынікі дысертацыі прадстаўлены ў 13 публікацыях, 6 з якіх надрукаваны ў рэцэнзуемых перыядычных выданнях.

***Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навук, па якіх яна прадстаўлена да абароны.***

Аўтарэферат В.А. Мусіенкі адпавядае патрабаванням ВАК і сведчыць аб тым, што выкананая дысертацыйная работа з'яўляецца самастойным, лагічным і завершаным даследаваннем на актуальную тэму, а яго аўтар заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства.

23 верасня 2022 г.

Доктар філалагічных навук
прафесар кафедры беларускай мовы
УА "ГДУ імя Ф. Скарыны" А.А. Станкевіч

Подпіс А.А. Станкевіч
ЗАВЯРАЮ
Начальнік аддзела кадраў
установы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны"
О.Т. Зайцава
23.09.2022

АДДЗЕЛ КАДРАЎ